**В.Г. Ігнатовіч**
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт*
*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», Рэспубліка Беларусь*

# МЕТАДЫЧНЫЯ АСНОВЫ АКТЫВІЗАЦЫІ ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПАДЛЕТКАЎ СРОДКАМІ НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

**Аннотація**. В статье изложены методические основы активизиции творческой деятельности подростков средствами народного искусства. Определены задачи и формы данного процесса. Рассмотрены его основные направления.

**Ключевые слова.** Творчество, творческая деятельность, художественная творческая деятельность.

На сучасным этапе ў нашым грамадстве ўзрасла цікавасць да народных традыцый і культурных каштоўнасцяў мінулага, бо фарміраванню светапогляда будучага пакалення садзейнічае далучэнне яго да культуры свайго народа. Гэта дазволіць вырасціць духоўна багатае пакаленне, адданае сваёй Радзіме, пакаленне, якое будзе імкнуцца замацоўваць і памнажаць годнасць і прыгажосць сваёй культуры і гісторыі. Таксама неабходнай справай сёння з'яўляецца ўкараненне ў педагагічны працэс навучальнай парадыгмы з апорай на этнакультуру.

Традыцыйныя святы на Беларусі з'яўляюцца жывой з'явай, таму асноўнай мэтай навучальных і культурных устаноў павінна стаць падтрыманне жыццёвасці гэтых традыцый, іх папулярызацыя, але рэальнасць нашага жыцця не садзейнічае іх росквіту. Важная роля ў працэсе адраджэння належыць традыцыйнай народнай культуры ва ўсіх яе праявах. Сензітыўным перыядам для выхавання жадання захоўваць традыцыі і папулярызаваць іх на навуковай аснове з'яўляецца падлеткавы ўзрост, а дзейнасцю, якая будзе найбольш эффектыўнай для працы ў дадзеных напрамках – мастацкая творчая дзейнасць.

Камунікацыя старэйшых падлеткаў мае тры галоўныя асаблівасці. З аднаго боку, у гэтым узросце школьнікаў цікавіць інфармацыя па розных пытаннях і шляхі яе папаўнення, з другога – фарміруюцца навыкі сацыяльнага ўзаемадзеяння, імкненне да самаазначэння як асобы, выбар жыццёвых каштоўнасцяў, з трэцяга – развіваецца пачуццё эмацыянальнага камфорту, разумення адзін аднаго, эмпатыя і эмацыянальная ўстойлівасць.

Мастацкая творчая дзейнасць садзейнічае развіццю разумовай і эмацыянальнай сфер асобы. Разумеючы гэта, педагогі з першых і да апошніх крокаў дзяцей у школе ўключаць іх у творчую дзейнасць, але гэта дзейнасць не абмяжоўваецца сценамі школы. Працэс і вынікі дадзенай дзейнасці адлюстраваны ў выніковых выставах і канцэртах, ў дзейнасці шматлікіх калектываў.

Паняцці «творчасць» і «развіццё» разглядаюцца ў цеснай сувязі. Творчасць мае вялікае значэнне, бо звязана з асабістым ростам асобы, гэта значыць, садзейнічае яго развіццю. «Ценностные ориентации на творчество являются духовной основой формирования взглядов, убеждений, норм жизнедеятельности, реальной готовности личности к определенному творческому типу поведения» [3, с. 318]. Працэс творчай дзейнасці выклікае ўнутранае самазмяненне суб'екта, які не толькі адкрывае для сябе новыя способы дзейнасці, шляхі і сродкі атрымання вынікаў, але і змяняе акаляючае яго асяроддзе. У нашым выпадку гаворка ідзе таксама аб захаванні і папулярызацыі традыцыйнай народнай спадчыны. Развіццё ўзнікае там, дзе чалавек узнімаецца на ступень вышэй, беручы за аснову папярэдні вопыт, і з'яўляецца неабходнай умовай існавання асобы, нацыі і чалавецтва ў цэлым. Пры гэтым яно абавязкова нясе ў сабе момант самаразвіцця суб'екта. «Ситуация невостребованности творческого потенциала и нереализованности творческих людей и их энергий не только лишает общество необходимых ему для развития сил, но и может оказаться, прямо небезопасна для его нормального существования и функционирования» [1, с. 315].

Для рэалізацыі і развіцця падлетка ў творчай дзейнасці, і, у прыватнасці, для развіцця яго творчага патэнцыялу, неабходнай умовай з'яўляецца комплекснае ўздзеянне мастацтва, бо некаторыя віды мастацтва (тэатральнае, харэаграфічнае, кінамастацтва і інш.) увогуле не могуць існаваць па-за межамі сінтэзу. А эфектыўнымі формамі працы з'явяцца тыя, якія дазволяць спалучыць у сабе некалькі відаў мастацтва, актывізаваць творчую дзейнасць школьнікаў і ўключаць ў сябе

© В.Г. Ігнатовіч, 2017

літаратурнае, музычнае, тэатральнае, харэаграфічнае і выяўленчае мастацтва. Дадзены шырокамасштабны сінтэз дасць магчымасць не толькі актывізаваць творчую дзейнасць вучняў, навучыць іх уменню творча вырашаць пастаўленыя задачы, але і дазволіць ім рэалізаваць сябе ў розных відах мастацтва і далучыць школьнікаў да народнай творчасці.

У працэсе правядзення пазашкольных заняткаў, якія пазнаёмяць падлеткаў з каляндарнымі святамі, плануецца вырашэнне наступных задач: знаёмства з каляндарнымі святамі і звязаннымі з імі абрадамі беларусаў і народным мастацтвам; ахова і зберажэнне рэгіянальнай і лакальнай традыцыйнай народнай спадчыны; выяўленне і вяртанне ў практыку разнастайных форм асноўных відаў фальклорнай спадчыны краю; развіццё фальклорна-мастацкіх уменняў і здольнасцяў, творчага патэнцыялу школьнікаў, умення выкарыстоўваць сувязь розных мастацкіх ведаў, уменняў і навыкаў з агульнымі ўстаноўкамі ў галіне этнакультуры; фарміраванне каштоўнасных арыенціраў і грамадскай думкі; усведамленне значнасці народнага мастацтва; выхаванне мастацкага густу, любві да роднай культуры, падрыхтоўка здольнага творцы ў галіне этнакультуры.

Пры правядзенні заняткаў з падлеткамі педагог можа выкарыстоўваць не толькі такія формы, як тэарэтычныя і практычныя заняткі, але і экскурсіі, канцэрты, конкурсы, семінары, творчыя лабараторыі, фестывалі, пошук новых талентаў, сустрэчы з цікавымі людзьмі (мастацкімі калектывамі, арганізатарамі фестываляў і святаў на Беларусі, супрацоўнікамі Інстытута Культуры Беларусі г.д.), наведванне краязнаўча-этнаграфічных музеяў, выстаў, прагляд відыёфільмаў, складанне картатэкі дадзеных аб каляндарных святах беларусаў, «банка» звестак аб традыцыях, што іх суправаджаюць, правядзенне творчых часоў, гульняў-падарожжаў, музычна-гульнявых комплексаў, конкурсаў, КВЗ, пастаноўкі «радыёп'ес», пантамім.

Мэтазгодна як мага болей выкарыстоўваць на практыцы прадукты творчай дзейнасці школьнікаў: арганізаваць святочныя выступленні ў розных навучальных і культурных установах з мэтай папулярызацыі беларускіх народных традыцый і развіцця камунікатыўных уменняў падлеткаў, бо «самое ценное произведение, возникающее в детском художественном творчестве, - это читатель-художник, формирующийся в юном авторе» [2, с. 53].

Цікавым і плённым бачыцца супрацоўніцтва са студэнцкімі, школьнымі, аматарскімі і прафесійнымі мастацкімі калектывамі, якія займаюцца творчым пошукам у гэтай галіне; настаўнікамі, выкладчыкамі краязнаўчых курсаў; з гурткамі па ткацтву, традыцыйнай вышыўцы, пляценню паясоў, пашыву народнага адзення, разьбе па дрэве, саломапляценню.

Зыходзячы з узроставых асаблівасцяў падлеткаў, а таксама іх мастацкай накіраванасці, рэкамендуецца даць магчымасць праявіць мастацкія і творчыя здольнасці кожнаму выхаванцу, рыхтуючы дадатковыя матэрыялы да тэарэтычных і практычных заняткаў. Гэта павінны быць не толькі тэарэтычныя веды, але і падрыхтоўка фота-, аудыё- і відыёматэрыялаў, альбомаў, малюнкаў, красвордаў, схем, творчых заданняў (напрыклад, пантамімы «Для якога свята характэрны дадзены абрад?»), а магчыма, з сумеснымі намаганнямі кіраўнікоў, арганізацыя вялікіх святаў і фестываляў. Створаныя школьнікамі касцюмы прапануецца захоўваць (у ідэале – у лабараторыі народнага мастацтва), выкарыстоўваць з года ў год, аднаўляць і перадаваць школьнікам папярэдніх класаў. Там жа зберагаць усе аксесуары, выкарыстаныя на святах. Магчыма арганізацыя шматузроўневага гуртка, дзе пэўны час заняткаў будзе адводзіцца на перадачу старэйшымі малодшым сваіх ведаў у галіне беларускай абраднасці.

Праводзячы пазашкольную працу, педагогі павінны творча падыходзіць да правядзення заняткаў, пашыраючы і ўдакладняючы іх змест, выкарыстоўваючы новыя формы працы і інавацыйныя тэхналогіі, зыходзячы з асаблівасцяў групы, месца правядзення заняткаў, сродкаў навучання і выхавання, абсталявання, імкненняў, жаданняў і магчымасцяў школьнікаў. Пры гэтым заняткі павінны быць максімальна разнастайнымі і насычанымі творчым пошукам школьнікаў, накіраваным на вырашэнне тых задач, якія дазволяць максімальна развіць творчы патынцыял асобы.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Ковалева Т.Ф. Реализация творческого потенциала человека – основа гармоничного развития общества // Философия и ценности современной культуры: материалы Международной научной конференции, Минск, 10–11 октября 2013 г. / А.И. Зеленков [и др.]; редкол.: А. И. Зеленков, А. А. Легчилин В. Т. Новиков; М-во образования, БГУ, ГНУ «Ин-т философии НАН Беларуси». – Электрон. текстовые данные. – Минск: БГУ, 2014. – С. 314 - 316.
2. Левин В.А. Воспитание творчества. - Томск: Пеленг, 1992. - 56 с.

Чумакова С.П. Ценностные ориентации учащихся на творчество как детерминанта их личностного развития // Психолого-педагогическое сопровождение личности в образовании: союз науки и практи-

ки: Сборник статей IV Международной научно-практической конференции, Одинцовских психолого-педагогических чтений, Одинцово, 21 февраля 2016 г. / Отв. ред. В.Е. Цибульникова. — М.: Издательство «Перо», 2016. — С. 316 - 318 с.